**Шылава А. С.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры менеджменту і адукацыйных тэхналогій Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі;
**Мурашка Н. У.**, магістрант.
Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка

# Эфектыўныя шляхі фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў праз прыказкі і прымаўкі на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання

Праблема фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі выклікае неабходнасць пошуку новых шляхоў, інтэнсіўных тэхналогій, якія садзейнічаюць эфектыўнаму засваенню ведаў і фарміраванню вучэбнай дзейнасці малодшых школьнікаў.

The problem of formation of speech and communicative competence at the first stage of General secondary education causes the need to find new ways, intensive technologies that contribute to the effective assimilation of knowledge and the formation of educational activities of younger students.

**Ключавыя словы:** маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя, тэхналогія калектыўнага ўзаеманавучання, прыказкі і прымаўкі.

**Keywords:** communicative and speech competence, technology of collective mutual learning, proverbs and sayings.

Адной з актуальных праблем на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі з'яўляецца фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў малодшых школьнікаў на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання. Пад тэрмінам «маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя» мы разумеем уменне карыстацца мовай у розных сітуацыях маўленчых зносін [1, с. 73].

Сучасная адукацыя накіравана на эфектыўны пошук шляхоў, якія б спрыялі фарміраванню маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў малодшых школьнікаў у вучэбнай дзейнасці. Выкарыстанне інтэнсіўных адукацыйных тэхналогій у сферы фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі дапамагло б настаўнікам пачатковых класаў дасягнуць высокіх вынікаў.

Пад інтэнсіўнымі тэхналогіямі навучання мы разумеем сістэму варыятыўных педагагічных тэхналогій, якія садзейнічаюць эфектыўнаму засваенню ведаў за адведзены час і забяспечваюць дасягненне загадзя спраектаваных вынікаў на аснове ўздзеяння і ўзаемадзеяння суб'ектаў дзейнасці [2, с. 21].

Адной з эфектыўных інтэнсіўных тэхналогій у галіне фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі можа быць тэхналогія калектыўнага ўзаеманавучання (або тэхналогія калектыўнага спосабу навучання), прапанаваная В. К. Дзьячэнка. Яе сутнасць заключаецца ў тым, што ўсе навучэнцы навучаюць кожнага і кожны навучае ўсіх. У структуру калектыўнага спосабу арганізацыі навучання ўваходзіць:

- праца вучня з крыніцай ведаў,
- індывідуальная праца вучня з настаўнікам,
- праца ў групе аднагодкаў,
- узаемнае навучанне [2, с. 22].

Разгледзім тэхналогію калектыўнага ўзаеманавучання як сродак фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі.

Працэс фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ўключае ў сябе:

- арганізацыю дзейнасці вучняў, якая садзейнічае шматбаковаму і асабоваму развіццю;
- рэалізацыю творчага патэнцыялу;
- развіццё міжасабовага ўзаемадзеяння;
- развіццё калектыўных адносін;
- развіццё разнастайных формаў зносін.

Акрамя таго, паспяховасць і эфектыўнасць працэсу фарміравання маўленча-камунікатыўнай

кампетэнцыі ў малодшых школьнікаў залежыць ад выкарыстання вучэбнага і гульнёвага відаў дзейнасці, а таксама ад пазнавальнай і творчай атмасферы, у якой адбываецца сам працэс фарміравання.

Улічваючы ўсё вышэйпералічанае, трэба адзначыць, што выкарыстанне тэхналогіі калектыўнага ўзаеманавучання само па сабе прадугледжвае арганізацыю дзейнасці вучняў і з'яўляецца момантам зносін. Арганізуючы заняткі па дадзенай тэхналогіі, мы ствараем вучэбна-гульнёвы від дзейнасці і працэс узаемадзеяння паміж вучнямі.

Яшчэ адным сродкам фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі, на нашу думку, з'яўляецца фальклор. Тэрмін «фальклор», што ў перакладзе азначае «народная мудрасць», спачатку ўключаў усю духоўную і матэрыяльную культуру народа: ад вераванняў, танцаў, музыкі да жылля і адзення. Сучасная навука не дае адзінай трактоўкі паняцця «фальклор», але найчасцей яно ўжываецца ў больш вузкім, больш канкрэтным значэнні: вусная народная творчасць.

Беларускі фальклор вельмі багаты і разнастайны. Ён прадстаўлены традыцыямі і звычаямі, гульнямі, песнямі, танцамі, вуснай народнай творчасцю. Увесь гэты матэрыял нясе ў сабе велізарны патэнцыял для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў. Але першае, на што хацелася б звярнуць увагу, — гэта вусная народная творчасць, таму што фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі цесна звязана з развіццём мовы і маўлення.

Да вуснай народнай творчасці прынята адносіць эпас (казкі, быліны, паданні, легенды) і малыя жанры (пацешкі, скорагаворкі, лічылкі, прыказкі і прымаўкі, загадкі і інш.). Мы больш падрабязна спынімся на прыказках і прымаўках.

***Прыказкі і прымаўкі*** — мудрасць народа, складзеная ў кароткую, ёмістую і даступную для ўсеагульнага разумення форму. Іх задача — данесці мудрыя народныя веды і калектыўны вопыт да кожнага чалавека ў даступнай, лёгкай форме. Выкарыстоўваючы ў сваім маўленні прыказкі і прымаўкі, дзеці вучацца ясна, лаканічна, выразна выказваць свае думкі і пачуцці, інтанацыйна афарбоўваць сваё маўленне, развіваюць уменне творча выкарыстоўваць слова, вобразна апісваць прадмет, даваць яму яркую характарыстыку.

Праца настаўніка з прыказкамі і прымаўкамі можа насіць фрагментарны, але ў той жа час сістэматычны характар. Трэба адзначыць, што карысць ад такой працы будзе велізарная. Прыказкі і прымаўкі тым і добрыя для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі, што яны лёгка, натуральна, у гульнёвай форме развіваюць вербальную камунікацыю. А вывучэнне іх з дапамогай тэхналогіі калектыўнага ўзаеманавучання будзе спрыяць больш эфектыўнаму развіццю мовы і маўлення.

Разгледзім працу па фарміраванні маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі праз прыказкі і прымаўкі на прыкладзе II класа па вучэбных прадметах «Беларуская мова» і «Літаратурнае чытанне».

Праца па фарміраванні маўленчай-камунікатыўнай кампетэнцыі з дапамогай прыказак і прымавак складаецца з некалькіх этапаў.

**Першы этап: вывучэнне і назапашванне**

Для правядзення першага этапу не патрабуецца нейкай асаблівай працы настаўніка па падборы і падрыхтоўцы прыказак і прымавак да ўрока, таму што ўсе яны ў дастатковай колькасці прыведзены ў падручніках і вучэбных дапаможніках па беларускай мове [3, 4] і літаратурным чытанні [5, 6]. Неабходна толькі змяніць падыход да працы. Для гэтага мы прапануем настаўніку завесці ў класе «скарбонку прыказак і прымавак». Гэта можа быць намаляваная карціна з кошыкам або куфарам ці нейкая невялікая скрынка.

Далей неабходна арганізаваць працу па зборы ў «скарбонку» саміх прыказак і прымавак. Ажыццявіць гэта можна наступным чынам.

Так, напрыклад, у другой частцы дапаможніка па літаратурным чытанні пасля верша В. Віткі «Чатыры пажаданні» прапанавана наступнае заданне:

«Прачытайце прыказкі. Растлумачце, як вы іх разумееце. Якое слова аб'ядноўвае сэнс гэтых прыказак?

Сам добры — людзі добрыя.

Добраму чалавеку ўсюды добра.

Добры чалавек і сабакі дражніць не будзе» [6, с. 11].

Да ўсіх вышэйапісаных заданняў мэтазгодна дадаць яшчэ адно: вывучыце адну з прыказак на памяць.

Для выканання апошняга задання мы прапануем правесці працу ў парах пастаяннага складу, падзяліўшы клас па варыянтах. Дзеці, якія сядзяць на першым варыянце, вучаць на памяць прыказку № 1, якія сядзяць на другім варыянце, — прыказку № 2. Для гэтага задання ім можна даць 1–2 хвіліны. Пасля чаго вучні першага варыянта павінны праверыць прыказку ў вучняў другога варыянту і наадварот. А затым вывучыць прыказку свайго суседа. Дадзеная праца дапамагае развіццю мовы, развіццю памяці і маўлення.

Калі заданне будзе выканана, настаўнік павінен папрасіць дзяцей прагаварыць гэтыя прыказкі хорам, пасля чаго прыказкі, загадзя напісаныя на паперы, можна скласці ў «скарбонку прыказак і прымавак».

Сістэматычнае правядзенне падобнай працы вядзе да назапашвання «скарбонкі прыказак і прымавак», якія неабходна пастаянна паўтараць і прагаворваць, вяртаючыся да іх на ўроках літаратурнага чытання ў час праверкі вывучанага матэрыялу альбо вывучэння новых твораў. Акрамя таго іх можна выкарыстоўваць і на ўроках беларускай мовы ў якасці, напрыклад, моўнай размінкі, тым самым выкарыстоўваючы ў сваёй працы міжпрадметныя сувязі.

### Другі этап: актыўнае выкарыстанне

Момант пераходу да другога этапу кожны настаўнік павінен вызначыць сам, бо на гэта ўплывае ўзровень гатоўнасці вучняў, тэма ўрока, форма працы, колькасць назапашаных прыказак і прымавак.

На ўроках літаратурнага чытання ў II класе настаўнік можа выкарыстоўваць прыказкі і прымаўкі на этапе ***падвядзення вынікаў урока***. Выкарыстанне гэтага матэрыялу для падвядзення выніку ўрока дапамагае вучням абагульніць матэрыял, узбагаціць свой лексічны запас, лепш зразумець сэнс твора.

Прыкладам такой працы ў рамках тэхналогіі калектыўнага ўзаеманавучання можа быць калектыўная форма працы, калі «палова вучняў гаворыць — палова слухае». Для гэтага настаўнік дзеліць клас на дзве групы і кожнай з іх дае канверт з аднолькавымі прыказкамі, якія вывучаліся раней. Так, у першым варыянце кожная група павінна выбраць з прапанаваных прыказак ці прымавак тую, якая падыходзіць да вывучаемага твора, і абгрунтаваць другой групе, чаму менавіта гэту прыказку яны выбралі.

У другім вырыянце адна група павінна выбраць з прапанаваных прыказак тую, якая, на іх погляд, падыходзіць да вывучаемага твора, і абгрунтаваць другой групе свой выбар, а другая група — выбраць тую, якая, на іх погляд, не падыходзіць да твора, і таксама абгрунтаваць свой выбар. Такая праца спрыяе разуменню тэмы ўрока, развівае маўленне, абагульняе матэрыял, вывучаны на ўроку.

Так, напрыклад, да тэксту М. Пазнякова «Шпачынае гняздо» [6, с. 43–45] настаўнік можа падабраць са «скарбонкі прыказак і прымавак» тры прыказкі пра дабро [6, с. 11], якія апісаны намі вышэй, і правесці калектыўную форму працы «Заданне ў канверце»:

***Настаўнік (Н.):*** Скажыце, што зрабіў Вадзік?

***Вучань (В.):*** Вадзік выратаваў птушак.

***Н.:*** Што гэты ўчынак кажа нам пра яго?

***В.:*** Што ён любіць птушак.

***В.:*** Што ён добры.

***Н.:*** Вы дакладна вызначылі, што такі ўчынак кажа нам аб любові Вадзіка да птушак, а таксама пра яго добрае сэрца. Зараз мы папрацуем у групах. Я падабрала з нашай «скарбонкі» прыказкі пра дабрыню і хачу, каб вы з імі папрацавалі. Для гэтага падзелімся на дзве групы. Кожная група атрымае заданне ў канверце. У канверце вы знойдзеце тры прыказкі. Вы павінны прачытаць іх, знайсці тую, якая больш за ўсё падыходзіць Вадзіку, і расказаць нам, чаму вы так вырашылі. На выкананне задання вам даецца 3–5 хвілін.

Правядзенне такой працы на ўроках літаратурнага чытання ў II класе будзе не толькі спрыяць фарміраванню маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі, але і падрыхтуе дзяцей да больш складанай працы ў III і IV класах. Працуючы з тэкстам твора на этапе ***замацавання вывучанага матэрыялу***, яны змогуць самастойна падбіраць прыказкі ці прымаўкі для характарыстыкі герояў твора або пры складанні плана тэксту. Вядома, гэта цяжкая, але цікавая праца, якая патрабуе ад вучняў пэўных ведаў вуснай народнай творчасці. Але трэба адзначыць, што калі настаўнік пастаянна працуе з фальклорным матэрыялам на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання, то, як правіла, такія заданні не будуць складанымі. А ў рамках тэхналогіі калектыўнага ўзаеманавучання яны могуць быць не толькі цікавымі, але яшчэ і вельмі карыснымі.

Падрыхтоўка да такога віду працы складаецца з некалькіх этапаў.

*Першы этап*: падбор прыказкі ці прымаўкі да вывучаемага твора, героя з прапанаваных варыянтаў.

*Другі этап*: падбор прыказкі ці прымаўкі да вывучаемага твора, героя самастойна, але па прапанаванай настаўнікам тэме.

*Трэці этап*: падбор прыказкі ці прымаўкі да вывучаемага твора, героя самастойна.

Абавязковай умовай такой працы з'яўляецца тое, што вучні заўсёды могуць карыстацца сабраным у «скарбонках» матэрыялам. Так яны будуць пастаянна аднаўляць у памяці тыя прыказкі і прымаўкі, якія яны вывучалі раней, і канцэнтравацца толькі на аналізе твора або характарыстыцы героя. Такая праца спрыяе больш глыбокаму разуменню тэксту твора, развіццю маўлення вучняў, актывізуе разумовыя працэсы.

Таксама фрагментарна можна выкарыстоўваць прыказкі і прымаўкі на ўроках беларускай мовы на розных этапах урока.

Так, на такім этапе ўрока, як ***моўная размінка***, можна працягваць вывучэнне прыказак і прымавак, узбагачаючы класную «скарбоку». Для гэтага можна выкарыстоўваць тыя прыказкі і прымаўкі, якія маюць прывязку да пары года. Прыклады такіх прыказак і прымавак:

#### Зіма

Зімовы дзянёк, што камароў насок.
Зімою сонца свеціць, ды не грэе.
Зіма ўцякае цёмнымі начамі.
Першы снег — не зіма.
Студзень — году пачатак, а зіме — палавіна.
Студзень зямлю студзіць.
Студзень хаты студзіць, рана гаспадароў будзіць.
Пытаецца люты, ці добра абуты?
Люты наробіць плюты.
Завірухі і мяцелі ў лютым наляцелі.

#### Вясна

Вясенні дзень год корміць.
Вясной зверху пячэ, а знізу марозіць.
Вясною работы ад нядзелі да суботы.
Першая ластаўка вясны не робіць.
У сакавіку то сонца грэе, то снегам вее.
Сакавік мокры — хлеб будзе горкі.
Красавік з вадой — май з травой.
Красавік сушыць — нічога з зямлі не рушыць.

Май дажджлівы — год урадлівы.
Май зямлю грэе, а северам вее.
Май лясы ў лісце апранае, лета ў госці чакае.

**Лета**

Што летам нарадзіцца, тое зімой прыгадзіцца.
Летні дзень зіму корміць.
Благое лета, калі сонца нету.
Хто летам позна спіць, той лета не бачыць.
Як управіўся касец і жнец, то і лету канец.
Ліпень косіць і жне, доўга спаць не дае.
Ліпень пякучы, але даручы.

**Восень**

Восень — на дзень пагод восем.
Восень не вясна: пакапае з лыжку, а ногі з гразі не выцягнеш.
Сваё зрабіла восень і адпачывае на палях.
Восень — работ восем.
Кастрычнік зямлю балоціць, а лес дык залоціць.
Бывае, што ўвосень сонца ззяе, а вада халадае.

На астатніх этапах урока беларускай мовы для працы з прыказкамі і прымаўкамі можна выкарыстоўваць наступныя формы:

1) напісанне ўзаемных дыктовак;
2) навучанне пастаноўцы пытанняў;
3) гульні з прыказкамі і прымаўкамі, накіраваныя на фарміраванне маўлення.

***Напісанне ўзаемных дыктовак.***

Прадугледжвае працу ў пары. Для гэтага вучань, які сядзіць на першым варыянце, выступае ў ролі «настаўніка» і дыктуе прыказку або прымаўку, а вучань, які сядзіць на другім варыянце, выступае ў ролі «вучня» і піша пад дыктоўку «настаўніка». Затым вучні мяняюцца ролямі.

*Варыянт 1.*

«Настаўнік» дыктуе прыказку або прымаўку, «вучань» запісвае яе. Затым «настаўнік» сумесна з «вучнем» правяраюць напісанае і выпраўляюць памылкі. Далей яны мяняюцца сваімі ролямі і паўтараюць тое ж самае яшчэ раз.

*Варыянт 2.*

«Настаўнік» прагаворвае пачатак прыказкі або прымаўкі, «вучань» завяршае яе. Далей «настаўнік» дыктуе прыказку цалкам, а «вучань» запісвае яе. Затым «настаўнік» сумесна з «вучнем» правяраюць напісанае і выпраўляюць памылкі. Пасля гэтага «вучань» дыктуе «настаўніку» прыказку, а «настаўнік» запісвае яе. І зноў яны сумесна правяраюць напісанае.

*Варыянт 3.*

Для гэтага варыянта лепш падрыхтаваць дзве прыказкі або прымаўкі і адно заданне па тэме ўрока. «Настаўнік» бярэ першую прыказку і дыктуе яе пачатак, «вучань» запісвае пачатак і самастойна дапісвае яе працяг. Пасля таго як прыказка запісана, «вучань» выконвае заданне па тэме ўрока. Затым «настаўнік» сумесна з «вучнем» правяраюць напісанае і выпраўляюць памылкі. Далей яны мяняюцца ролямі і «новы настаўнік» бярэ другую прыказку і паўтарае ўсё вышэйапісанае з «новым вучнем». Прывядзём прыклад.

Для выканання задання возьмем прыказкі са «скарбонкі прыказак і прымавак», якія раней вывучаліся на ўроку літаратурнага чытання.

***Н.:*** Цяпер мы папрацуем у парах. Вучні, якія сядзяць на першым варыянце, будуць у нас «настаўнікамі». Яны бяруць прыказку № 1 і дыктуюць яе пачатак сваім суседзям па парце. Вучні, якія сядзяць на другім варыянце, павінны будуць запісаць пачатак прыказкі пад дыктоўку, самастойна дапісаць яе працяг і падкрэсліць словы з гукам [дз']. Пара, якая скончыла працу, падымае руку.

Прыказка 1:

*У <u>лістападзе</u> гола... (ў <u>садзе</u>)* [5, с. 22].

***Н.:*** Зараз выконваем сумесную праверку таго, што напісалі нашы «вучні», і выпраўляем памылкі. Хто гатовы, падымае вочы на мяне.

***Н.:*** Цяпер вучні, якія сядзяць на другім варыянце, будуць у нас «настаўнікамі». Бярэм прыказку № 2 і выконваем усе тое ж самае.

Прыказка 2:

*Зімовы <u>дзянёк</u> што... (камароў насок)* [5, с. 57].

***Н.:*** Выконваем сумесную праверку і выпраўленне памылак. Пасля таго як выканаеце заданні, ацаніце сябе і сваю працу. Паспрабуйце знайсці словы адабрэння за добрую працу для тых сваіх сяброў, якія ўсё выканалі правільна. Напрыклад: «Малайчына, ты выдатна справіўся з заданнем!» А для тых, хто дапусціў памылку, падбярыце словы падтрымкі. Напрыклад: «Не перажывай, у цябе ўсё атрымаецца!»

***Навучанне пастаноўцы пытанняў.***

Методыка навучання малодшых школьнікаў пастаноўцы пытанняў і адказаў на іх падрабязна апісана ў кнізе А. С. Шылавай «Учим радостно, успешно, с интересом и улыбкой» [2, с. 31–42], мы толькі разгледзім магчымасць выкарыстання апісанай методыкі на ўроку беларускай мовы на прыкладзе прыказак і прымавак.

Навучанне пастаноўцы пытанняў таксама прадугледжвае працу ў пары па сістэме «настаўнік — вучань», апісаную намі вышэй. Разгледзім на канкрэтным прыкладзе.

«Настаўнік» чытае прыказку і задае пытанні, «вучань» адказвае на іх.

***«Н.»:*** Студзень зямлю студзіць [3, с. 82]. Пра што гаворыцца ў сказе?
***«В.»:*** Пра студзень.
***«Н.»:*** Што студзень робіць?
***«В.»:*** Студзень студзіць.
***«Н.»:*** Што студзень студзіць?
***«В.»:*** Студзень студзіць зямлю.

Усё вышэйапісанае спрыяе разуменню слоў, навучанню правільнай пастаноўцы пытанняў, рыхтуе вучняў да працы са сказам. Аднак трэба

адзначыць, што не ўсе прыказкі падыходзяць для такой працы. Неабходна памятаць, што ў пачатковых класах можна выкарыстоўваць толькі тыя прыказкі і прымаўкі, якія маюць адну поўную граматычную аснову.

Прыкладамі такіх прыказак і прымавак могуць быць:

Зіма на лета працуе [3, с. 78].

Лянок не любіць ляноты [4, с. 104].

Адклад не ідзе ў лад [4, с. 69].

Ластаўка вясну пачынае [4, с. 113].

***Гульні з прыказкамі і прымаўкамі, накіраваныя на фарміраванне маўлення.***

Гульня і гульнёвыя формы іграюць значную станоўчую ролю ў фарміраванні маўленчакамунікатыўнай кампетэнцыі. Л. С. Выгоцкі адзначаў, што ў школьным узросце гульня і заняткі, гульня і праца ўтвараюць два асноўныя рэчышчы, па якіх працякае дзейнасць школьнікаў. Гульня дазваляе дзіцяці атрымліваць неабходны набор ведаў пра спосабы эфектыўнага ўзаемадзеяння і іх выкарыстанне ў практыцы зносін. Акрамя таго, у гульні развіваецца пачуццё калектывізму, адказнасці адзін за аднаго, фарміруецца вопыт маральных паводзін; стымулюецца развіццё творчай, пошукавай актыўнасці.

Разгледзім прыклады некалькіх гульняў, накіраваных на фарміраванне маўлення.

### *Гульня «Снежкі»*

*Варыянт 1.*

Дзеці дзеляцца на дзве групы. Настаўнік задае тэму, напрыклад, «Зіма» («Вясна», «Лета», «Восень»). Дзеці «закідваюць» адзін аднаго «снежкамі». Кожны рух рукой суправаджаецца прыказкай ці прымаўкай на зададзеную тэму.

*Варыянт 2.*

Настаўнік дзеліць вучняў на чатыры групы, кожная група выбірае капітана. Капітан шляхам жараб'ёўкі выбірае тэму, з якой будзе працаваць яго група: «Зіма», «Вясна», «Лета», «Восень». Кожная група выбірае са «скарбонкі» па тры прыказкі ці прымаўкі па сваёй тэме, пасля чаго праводзіцца турнір паміж камандамі. Група «Зіма» кідае свой першы сняжок групе «Вясна» і чытае пачатак выбранай прыказкі, напрыклад: «Зімою сонца свеціць...», а група «Вясна» павінна прадоўжыць прымаўку «...ды не грэе». У выпадку, калі каманда «Вясна» не зможа адказаць, то каманда «Зіма» хорам называе ўсю прыказку цалкам і перадае ход камандзе «Вясна». Другі сняжок каманда «Вясна» кідае камандзе «Лета» і г. д. Гульня праходзіць па схеме:




### *Гульня «Дапоўні»*

*Варыянт 1.*

Настаўнік прапануе вучням назваць другую частку прыказак ці прымавак, першая частка якіх напісана на дошцы або на картцы.

У студню вады не льюць, а... (ў лес дроў не вязуць).

Да чыстай крыніцы... (сцежка ўтоптана).

У крыніцу... (не носяць вадзіцу) [4, с. 48].

*Варыянт 2.*

З'яўляецца адваротным варыянтам гульні. Настаўнік прапануе вучням назваць першую частку прыказак ці прымавак, другая частка якіх напісана на дошцы або на картцы.

(Напалоханая варона) ...і вераб'я баіцца.

(Слязамі) ...ворага не паб'еш [4, с. 69].

### *Гульня «Хто хутчэй»*

*Варыянт 1.*

Настаўнік дзеліць вучняў на групы па колькасці падрыхтаваных картак (напрыклад, на чатыры групы). На кожнай картцы запісана прыказка з прапушчаным словам, а ўнізе на картцы некалькі слоў, з якіх яны павінны выбраць патрэбнае. Капітан кожнай каманды падыходзіць да стала настаўніка, бярэ адну з картак, бяжыць да сваёй каманды, чытае прыказку, запісаную на картцы, і ўсе разам падбіраюць патрэбнае прапушчанае слова. Знайшоўшы патрэбнае слова, уся каманда ўстае. Так яна паказвае, што каманда справілася з заданнем. Прыклады картак:

**Картка № 1**

Пры сонейку цёпла, пры ... добра [3, с. 33].
*Варона, няўмечка, матуля, ягада.*

**Картка № 2**

У ... не баляць ні ручкі, ні плечкі [3, с. 40].
*Варона, няўмечка, матуля, ягада.*

**Картка № 3**

Свой час ... , свой час баравіку [3, с. 61].
*Варона, няўмечка, матуля, ягада.*

**Картка № 4**

З роднага боку і ... мілая [3, с. 100].
*Варона, няўмечка, матуля, ягада.*

*Варыянт 2.*

Настаўнік дзеліць вучняў на групы па колькасці падрыхтаваных канвертаў (напрыклад, на восем груп. Зручней працаваць, калі дзеці, якія сядзяць на дзвюх суседніх партах, аб'ядноўваюцца ў адну каманду). У кожным канверце знаходзіцца разрэзаная на некалькі частак прыказка. Капітан кожнай каманды падыходзіць да настаўніка, бярэ канверт, вяртаецца да сваёй каманды, дастае фрагменты

прыказкі, раскладвае іх на парце, чытае. Усе разам абмяркоўваюць, збіраюць фрагменты прыказкі ў адзінае цэлае. Калі заданне выканана, капітан каманды падымае руку і кажа: «Мы гатовы!» Перамагае тая каманда, якая хутчэй выканала неабходнае заданне. Прыклады разрэзаных на фрагменты прыказак прыведзены ў табліцы.

***Гульня «Знаўцы»***

Настаўнік дзеліць клас на дзве групы. Адна група павінна ўспомніць і расказаць прыказкі ці прымаўкі пра працу, другая — пра навуку (навука — найлепшае багацце; не ганарыся званнем, а ганарыся ведамі [4, с. 54]; рукі малыя, ды да працы ўдалыя [4, с.145]; садок пасадзіў — добрую справу зрабіў [4, с. 14]).

Мы паказалі на прыкладзе II класа эфектыўнасць формы працы з прыказкамі і прымаўкамі пры фарміраванні маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання. Прапанаваныя формы могуць прымяняцца для працы таксама ў III і IV класах, акрамя таго іх можна змяняць пад вывучаемы матэрыял, спрашчаць ці ўскладняць у залежнасці ад магчымасцей і асаблівасцей вучняў.

Такім чынам, выкарыстанне тэхналогіі калектыўнага ўзаеманавучання дапамагае рацыянальна арганізаваць адукацыйны працэс, павысіць яго эфектыўнасць, прымяняць асобасна арыентаваны падыход, ствараць умовы для актыўнай уласнай пазнавальнай дзейнасці кожнага вучня, арганізоўваць «сітуацыі поспеху», развіваць самакантроль і ўзаемакантроль.

*Табліца* — Прыклады картак да другога варыянта гульні «Хто хутчэй»

| Канверт | Прыказка | Фрагменты прыказкі |
|---|---|---|
| 1 | Адна ластаўка вясны не робіць [3, с. 29]. | ластаўка, не, вясны, адна, робіць |
| 2 | Ласкавае слова — што дзень ясны [3, с. 40]. | дзень, ласкавае, ясны, слова, што |
| 3 | Лета збірае, а зіма праядае [4, с. 104]. | праядае, а, лета, зіма, збірае |
| 4 | Адной рукой і вузлоў не звяжаш [3, с. 29]. | рукой, і, адной, звяжаш, вузлоў, не |
| 5 | Не так лёгка зрабіць, як сказаць [4, с. 27]. | так, не, сказаць, лёгка, як, зрабіць |
| 6 | Языком малоць — не дровы калоць [4, с. 27]. | калоць, дровы, языком, не, малоць |
| 7 | Салаўя песнямі не накорміш [3, с. 29]. | накорміш, салаўя, не, песнямі |
| 8 | Матуліны рукі заўсёды мяккія [4, с. 42]. | мяккія, заўсёды, рукі, матуліны |

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Кузнецова, В. В.* Коммуникативно-речевая компетенция — основа профессиональной культуры учителя / В. В. Кузнецова // Человек и образование. — 2010. — № 2. — С. 71–73.
2. *Шилова, Е. С.* Учим радостно, успешно, с интересом и улыбкой. 1–4 классы : методическое пособие для учителей : в пяти книгах / Е. С. Шилова. — Минск : Адукацыя і выхаванне, 2017. — Кн. 1. — 136 с.
3. *Свірыдзенка, В. І.* Беларуская мова : падручнік для 2 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з рус. мовай навучання : у 2 ч. / В. І. Свірыдзенка. — 2-е выд. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2015. — Ч. 1. — 111 с.
4. *Свірыдзенка, В. І.* Беларуская мова : падручнік для 2 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з рус. мовай навучання : у 2 ч. / В. І. Свірыдзенка. — 2-е выд. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2015. — Ч. 2. — 127 с.
5. *Антонава, Н. У.* Літаратурнае чытанне : вучэб. дапаможнік для 2 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з рус. мовай навучання : у 2 ч. / Н. У. Антонава, І. А. Буторына, Г. А. Галяш. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2016. — Ч. 1. — 135 с.
6. *Антонава, Н. У.* Літаратурнае чытанне : вучэб. дапаможнік для 2 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з рус. мовай навучання : у 2 ч. / Н. У. Антонава, І. А. Буторына, Г. А. Галяш. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2016. — Ч. 2. — 135 с.
7. Прыказкі і прымаўкі : Беларус. нар. творчасць : у 2 кн. / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: А. С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : Навука і тэхніка, 1976. — Кн. 1. — 560 с.


*Матэрыял паступіў у рэдакцыю 28.10.2019*